# ДА ПЫТАННЯ АБ БАРАЦЬБЕ З КАРУПЦЫЯЙ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

А. Д. Воінава

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Актуальнасць разгляду пытання аб карупцыі дзяржаўных служачых абумоўлена ў першую чаргу тым, што карупцыя разам з бюракратызмам, з нізкім узроўнем маральнасці многіх прадстаўнікоў дзяржаўнага апарата стварае небяспеку і дэфармуе дзяржаўную палітыку і заканадаўчую базу дзяржаўнай службы. Карупцыя негатыўным чынам уплывае на развіццё эканомікі і сацыяльнай інфраструктуры (розных галін і відаў дзейнасці, задача якіх заключаецца ў задавальненні патрэб людзей, гарантаванні неабходнага ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва, забеспячэнні ўзнаўлення чалавечых рэсурсаў і прафесійна падрыхтаваных кадраў для ўсіх сфер нацыянальнай эканомікі). Карупцыя ў дадзеным выпадку раз’ядае органы дзяржаўнай улады і кіравання. З прычыны карумпаванасці значнай часткі прадстаўнікоў вышэйшай, цэнтральнай і мясцовай улады грамадзяне могуць, напрыклад, пазбаўляцца бясплатных абавязковых паслуг у галіне адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння, а шэраг іншых паслуг могуць стаць для іх платнымі. Карупцыя з’яўляецца асноўнай прычынай беспакаранасці, паколькі дазваляе парушальнікам пазбягаць юрыдычнай адказнасці за ўчыненыя супрацьпраўныя дзеянні. У выніку, прэстыж судовых і праваахоўных органаў значна зніжаецца, а дзяржаўная ўлада губляе свой аўтарытэт у вачах насельніцтва, што фарміруе небяспечную з’яву – прававы нігілізм, – поўнае або частковае непрыняцце сродкаў прававога рэгулявання як не здольных служыць задавальненню інтарэсаў і дасягненню мэт суб’ектаў права [1, с. 301–302].

У сучасным свеце дрэнная якасць арганізацыі дзейнасці адміністрацыйных органаў, сацыяльна-псіхалагічны мікраклімат, каторы склаўся ў іх, стыль функцыянавання і г.д. – ўсё гэта спрыяе далейшаму развіццю карупцыі [1, с. 301]. Аднак, вытокі карупцыі на старажытнарускіх землях адносяцца як мінімум да IX–X стст., калі ў ранефеадальнай Кіеўскай Русі ўзнікла паняцце “кармленне”, якое і прывіло і княжым людзям, і насельніцтву ўражанне, што карупцыя – звычайная з’ява, без якой ніяк абыйсціся нельга [2, с. 48].

Злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі па дзяржаўнай службе – нярэдкая з’ява, паколькі яны складаюць рысу бюракратыі і існуюць у кожным адміністрацыйным апараце. Да таго моманту, як Расійская імперыя сфармавалася як абсалютысцкая дзяржава (1721–1917), яна ўжо мела стабільны бюракратычны апарат і шматвекавую традыцыю “кармлення”, якія выкараніць было практычна немагчыма. Напрыканцы XVIII ст. актуальным

стаў фаварытызм, які толькі падмацоўваў карупцыйную дзейнасць. Непаразуменне і незадаволенасць з боку грамадства выклікала тое, што Кацярына II (1762–1796) дарыла сваім фаварытам-хабарнікам землі, дарагія рэчы, прысвойвала ім вышэйшыя ўзнагароды. Такім чынам, існавала ўрадлівая глеба для размнажэння злоўжываннямі службовымі паўнамоцтвамі [3, с. 112]. Карупцыя ў часы Расійскай імперыі мела шмат праяў, адной з якіх з'яўляўся подкуп суддзяў, якія імкнуліся выконваць працу за найбольшую плату. Падмацоўвала такую дзейнасць адсутнасць самастойнага натарыяту, функцыі якога выконвалі суды. Існавалі нават расцэнкі аплаты паслуг: за рэгістрацыю дакумента судовыя чыноўнікі бралі 15 капеек, а для таго, каб прыкласці да яго пячатку − у 10 разоў больш. Неабгрунтавана высокія расцэнкі суправаджаліся судовай валакітай (суддзі наўмысна зацягвалі тэрміны разгляду спраў), з-за чаго грамадзяне вымушаны былі пастаянна "маяцца ў судах" [4, с. 70]. Расійскі ўрад бачыў праблему і спрабаваў усімі магчымымі сродкамі здушыць любое карупцыйнае дзеянне. Беларускі навуковец І. У. Вішнеўская дала сваю адзнаку антыкаруцыйнай палітыкі, у тым ліку ў галіне законатворчасці і правапрымянення, якая праводзілася ў канцы XVIII–XIX ст. [3, с. 114]. Да сярэдзіны XVIII ст. гэтая палітыка адначасова ажыццяўлялася праз тры віды дзейнасці: папераджальную, карную і правааднаўленчую. Такі падыход дазваляў трымаць карупцыю на сацыяльна прымальным узроўні.

У часы, калі беларускія землі сталі часткай Расійскай імперыі (1772–1917), праблема карупцыі набыла больш масавы характар, чым у папярэднія часы, і аказала істотны ўплыў на ўсе сферы жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства. Чыноўнікі паспяхова карысталіся сваім уплывовым становішчам і не ведалі межаў для сваіх жаданняў, што адмоўна адбівалася на працы дзяржаўных органаў, таму неўзабаве ўлады сталі прымяняць свае сродкі па барацьбе з такой антысацыяльнай з'явай. На землі Беларусі распаўсюджвалася агульнаімперскае заканадаўства, у тым ліку тое, што тычылася супрацьдзеяння карупцыйным дзеянням.

Адным з самых першых заканадаўчых актаў, прынятых у якасці сродку па барацьбе з карупцыяй, паслужыў указ Аляксандра I "О непреступлении губернатором пределов власти, назначенным им законами", які быў выдадзены 16 жніўня 1802 г. [5, с. 221–222]. Перадумовай да выдання дакумента паслужыла "... дело о калужском губернаторе, который одолжил у фабриканта Гончарова 30 тыс. рублей и затем отказался их возвратить, грозя в случае взыскания их сослать Гончарова в Сибирь за азартную игру, к которой злосчастный фабрикант не имел ни малейшего касательства. С помещика Хитрова губернатор взял взятку в 75 тыс. рублей за скорытие совершенного убийства. Когда Державин начал производить следствие, то на него посыпались в С.-Петербург доносы, что он якобы запугивает свидетелй и заставляет их давать ложные показания, что он подрывает авторитет власти и т.д." [6, с. 168–169]. Урад быў занепакоены такімі абставінамі. "В 1802-м году Александр I в указе псковскому губернатору выражает твердую

решимость искоренить взяточничество: “... я считаю нужным предварить вас сим, что, при малейшем открытии злоупотреблений со стороны гражданских начальств на будущее время, все виновные в оном не только преданы будут всеобщему поношению, но как сами попадут суду по всей сторогости законов, так и начальников губерний оному подвергнут, если по слабости их смотрения, а паче по сноровке и участию (чего по важности их звания и существу доверия моего к ним и предположить в них без всякого отвращения я не могу) зло сие допушено, терпимо или сокрываемо ими будет. Подтвердив о строгом за сим наблюдении всем гражданским губернаторам, и вам о том же самом предписываю” [6, с. 169–170]. У якасці меры процідзеяння карупцыі і быў прыняты ўказ, у п. 11 арт. 20.372 адзначана, што існавала неабходнасць спыніць “гнусное лихоимство, отвращая малейшее поползновение к оному во всех подчиненных им” [5, с. 222]. Такое замацаванне норм у Расійскай імперыі не аказала належнага ўздзеяння. “Декабрист Штейнгель указывает, что правительство доказало свое бессилие искоренить взяточничество и этим вызвало против себя недовольство. Посылались сенаторы, производили исследования, тысячами отдавали бедных чиновников под суд и определяли новых, те принимались за то же, только смелее, ... Сколько и теперь есть губернаторов, состоящих под бесконечным судом” [6, с. 171].

Урад вымушаны быў увесь час распрацоўваць і выдаваць новыя заканадаўчыя акты для таго, каб стрымліваць праявы карупцыі і не дазваляць ёй пашыраць поле сваёй дзейнасці, і ўсё гэта адбывалася з-за неэфектыўнасці працы службоўцаў на месцах і іх павальнае хабарніцтва. Пры Мікалаі I у 1837 г. быў прыняты агульны наказ грамадзянскім губернатарам, які пацвярджаў неабходнасць устрымлівацца ім ад пабораў з насельніцтва і іншых злоўжыванняў, але такі наказ не ўнёс істотных змен і аказаўся малаэфектыўным [7, с. 361–439].

Пасля замаху на Аляксандра II 2 красавіка 1879 г. быў падпісаны Указ аб прадастаўленні губернатарам “доўгачаканага” права сцвярджаць на пасадзе ўсіх асоб, служачых па земскіх і гарадскіх установах [8]. Указ паставіў у залежнае становішча большасць чыноўнікаў ніжэйшага звяна, што ў далейшым справакавала новую хвалю злоўжыванняў і хабарніцтва. Калі неабходная аддача не была атрымана, то ўрад 8 жніўня 1880 г. адмяніў указ аб кантролі губернатара за ўсімі кадравымі прызначэннямі ў земскіх і гарадскіх установах [9, с. 97].

Неабходна адзначыць, што з-за непраўамерных дзеянняў ніжэйстаячых чыноўнікаў пакутавалі самі губернатары, паколькі неслі адказнасць за ўсю дзейнасць піраміды мясцовай улады. Для кантролю гэтай сітуацыі выдаваліся губернатарскія акты, напрыклад Цыркуляры ніжагародскага губернатара аб парадку накладання адміністрацыйных спагнанняў за парушэнне абавязковых пастаноў губернатара былі выдадзены ў 1913 г. (справа №1169) [10]. Чыноўніцкае асяроддзе мела бескантрольную ўладу, што з’яўлялася

прычынай учынення розных злоўжыванняў. Давер народа да чыноўнікаў і губернатараў падаў, а іх аўтарытэт у вачах людзей значна зніжаўся.

Вопытны губернатар са шматгадовым стажам П. П. Шыдлоўскі пакінуў сваю пасаду ў 1913 г. і аргументаваў свой крок карэспандэнту, які браў у яго інтэрв'ю, тым што "уход со службы явился результатом невозможности... честно и плодотворно работать в провинции. Такое хвастовство акционности и поддержка сторонних лиц, подчас сомнительной репутации, являются ныне гарантией от мелких и больших неприятностей по службе. Я подал в отставку, другие, попав в мою ситуацию, ограничиваются лишь молчанием и киванием головы" [11, с. 181–182]. З-за таго, што ў чыноўніцкім асяроддзі была практычна бескантрольная ўлада і меліся вялізныя паўнамоцтвы, гэта спрыяла здзяйсненню новых злачынстваў і разбэшчванню пласта дзяржаўных службоўцаў.

Аднак, нават у той час усё ж-такі быў узорна-паказальны губернатар, які спраўляўся з карупцыйнымі дзеяннямі, і вельмі ўдала. М. М. Сперанскаму (1772–1839) было 22 сакавіка 1819 г. "всемилостивейше повелено быть сибирским генерал-губернатором". Ён быў накіраваны Аляксандрам I (1777–1825) для навядзення строгага парадку – усё гэта адбылося пасля выкрывальных дакладаў, якія паступілі ад інспекцыі і двух сенатараў імператару. Ён праводзіў актыўную дзейнасць па ліквідацыі карупцыі, і караў службовых асоб, якія займаліся карупцыйнымі дзеяннямі. Напрыклад, былі вызвалены ад пасад 9 "камісараў" у пакаранне за злоўжыванні, вызвалены няшчасны "бязвінны вязень", каторы па капрызе губернатара ў Табольскай, Томскай, Іркуцкай губернях Пестэля Івана Барысавіча (1765–1843) правёў у зняволенні 12 гадоў. Сперанскі змог пакараць некалькіх губернатараў, сярод іх быў Д. В. Ілічэўскі (1786–1837) – томскі губернатар, Н. І. Трэскін (1763–1842) – іркуцкі губернатар, якія былі зняты з пасады за злоўжыванне паўнамоцтвамі. І тады Міхаіл Міхайлавіч звярнуўся да цара аб адхіленні гэтых губернатараў: "По общей инструкции сибирскому генерал-губернатору предоставлено <право> сменять, удалять и отрешать чиновников, коих определение зависит от Правительствующего Сената; о высших же чиновниках губернских велено представлять на дальнейшее (Высочайшее) усмотрение" [11, с. 182–183]. Гэты станоўчы прыклад пацвярджае думку аб тым, што асоба губернатара часта адыгрывала першарадную ролю ў праводзімай ім палітыцы.

Пасля нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863–1864 гг. беларускія землі знаходзіліся ў складаным палітычным становішчы, назіралася правядзенне жорсткай і непаслядоўнай урадавай палітыкі, што разам з няроўнасцю сацыяльных пластоў, адсутнасцю належнага кантролю за дзейнасцю дзяржаўнага апарату прывяло да шматлікіх свавольстваў з боку чыноўнікаў. Асноўнымі прычынамі ўчынення службовымі асобамі злачынстваў з'яўляліся: нізкі ўзровень даходу на дзяржаўнай службе ў параўнанні з высокімі цэнамі на тавары, няведанне грамадзянамі сваіх правоў і абавязкаў, а таксама прафесійная некампетэнтнасць бюракратыі.

Карупцыя стала набіраць большы абарот ва ўмовах дарагоўлі на прадукты харчавання, бытавыя прадметы, у якіх меў патрэбу чыноўнік і яго сям'я. Старшыня Бабруйскага сіроцкага суда Я. І. Гаўрылаў, абвінавачаны ў 1910 г. у нядбайным стаўленні да службы, паведамляў: “У мяне так мала людзей і сродкаў для навядзення парадку ў велізарнай колькасці спраў. Я плачу за працу па бягучых справах з асабістах сродкаў і адзін не ў стане ўсім займацца, а горад сродкаў на канцылярыю не дае” [12]. Высветлілася, што прафесійная этыка і маральныя якасці чыноўнікаў знаходзяцца на нізкім узроўні, які не дазваляе выконваць ім належна свае абавязкі. Матэрыялы паведамляюць аб бюракратызме, хабарніцтве, п'янстве, як правіла, рускіх чыноўнікаў. Генерал-ад'ютант Э. Т. Баранаў (1866–1868) адзначаў, што ў беларускіх губернях “злоупотребление чинами дошло до такой степени, когда его нельзя искоренить только законами” [13, с. 275–276].

Атрыманне хабару было нармальнай справай для любога служачага, але паводле статыстыкі, за дадзены від злачынства чыноўнікі караліся даволі-такі рэдка. Ёсць пацвярджэнне лічбамі: у 1887–1912 гг. судамі было вынесена толькі 81 прысудаў за хабарніцтва і ліхвярства [14, с. 151]. Дадзеная статыстыка паказвае толькі на адно: улады разумелі сутнасць гэтага віду дзеянняў і заплюшчвалі вочы на шматзначныя, хоць і невялікія сумы хабараў “бедным чынам”. У дзяржаўных органаў было цэласнае меркаванне на гэты конт: “чиновник, не берущий взяток, был чем-то вроде белой вороны. Взятки просто считались благодарностью за труд, недостаточно оплачиваемый государством. Получение взятки считалось хорошим условием выполнения служебных полномочий. Берущих без вымогательства даже не считали за взяточников, а за таковых признавали только вымогателей” [13, с. 233].

Мяшчане Бабруйска ў 1863 г. звярталіся да Мінскага губернатара са скаргай на хабарніцтва і злоўжыванне паўнамоцтвамі кіраўніка Г. Валчанінава [15]. Старэйшы засядацель Пінскага раённага паліцэйскага ўпраўлення І. П. Правасудзіч прыгразіў сялянам наваколля Старова крымінальнай справай за разбой, які яны насамрэч не ўчынялі. Сяляне, якія так баяліся пакарання, далі чыноўніку хабар, каб справу не разглядалі далей [16]. Пінскі шэф паліцыі С. Красікаў у рапарце ад 14 чэрвеня 1900 г. просіць не прыцягваць адміністрацыю гарадской турмы за адмову ад незаконных збораў з прыбываючых арыштаваных на пакрыццё выдаткаў турмы [17]. Усе гэтыя выпадкі сведчаць аб тым, што карупцыйныя дзеянні былі распаўсюджаны не толькі сярод дзяржаўных службоўцаў, а таксама і сярод звычайных людзей.

Справа, якая адбылася ў Пінскім павеце ў 1899 г., найбольш яскрава паказвае ўсю праблематыку – карумпаванасць і прадажнасць мясцовых улад. Пачаткам гэтай справы паслужыў данос грамадзян Лунінца. Сяляне прасілі аб высяленні габрэйскіх сем'яў з горада, і адзначалі: “Павятовая паліцыя, асабліва прыстаў 1-га стану, Марозаў, творыць нябачанае беззаконне і злачынства горш за злачынцаў і махляроў. Прыстаў прапісаў у вёсцы каля 200 габрэйскіх сем'яў, якім забаронена тут пражываць па законах. Габрэі

зарабляюць тут рознымі злачынствамі, а Марозаў пакрывае ўсе злоўжыванні пасля атрымання хабараў... Галоўны прыбытак прыстава Марозава – выручка за габрэйскую сінагогу, пастаўленую паблізу праваслаўнай царквы. Габрэі за сінагогу папаўняюць "касу" прыстава кожны тыдзень. Кожны габрэйскі пасяленец па спісе духоўнага равіна і касіра Дзятлавіцкага ўносіць "плату"... Марозаў неаднаразова выхваляўся, што "яго злодзеі зрабілі прыставам і ён ім, злыдням, абавязаны служыць" [18].

З другой паловы XIX ст. уладамі былі прынятыя дастатковыя меры па барацьбе з карупцыйнымі дзеяннямі не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў цэлым па ўсёй Расійскай імперыі. Увага была засяроджана на ўнутранай палітыцы, якая змагла прывесці да станоўчых вынікаў: удасканаленне заканадаўства ў барацьбе з хабарніцтвам служачых, узмацненне кантролю за дзейнасцю чыноўнікаў шляхам увядзення рэгулярных рэвізій. Таксама ў якасці меры па барацьбе з карупцыяй было арганізавана павышэнне ўзроўню матэрыяльнай забяспечанасці дзяржаўных служачых. Урад не раз павялічваў аклады чыноўнікам, ім таксама даваліся перавагі на беларускіх землях для прыезджых служачых з рускіх губерняў.

Закон падзяляў карупцыю на дзве катэгорыі: хабарніцтва і ліхвярства. Хабарніцтва мела на ўвазе пад сабой незаконнае наўмыснае атрыманне дзяржаўным служачым грошай або іншых матэрыяльных каштоўнасцяў (Разд. IV − О преступл. и проступ. противъ порядка управления) [19]. Чыноўнік, якога прызналі вінаватым у хабарніцтве, павінен быў заплаціць штраф, аднак, да асноўнага пакарання магла прымяняцца і дадатковая кара – звальненне з пасады. Ліхвярства ўяўляла сабой больш цяжкі від злачынства, і абазначалася як "незаконныя пабары пад выглядам дзяржаўных падаткаў; вымагальніцтва рэчамі, грашыма і харчамі" (Разд. IV − О преступл. и проступ. противъ порядка управления) [19].

На наш погляд, пакаранне за ліхвярства павінна было мець цяжэйшы характар, чым за хабарніцтва. Як згадвалася раней, хабарніцтва – незаконная ўзнагарода, якая даецца па жаданні асобы, якая хоча атрымаць некаторыя прывілеі. Ліхвярства ўяўляе сабой вымагальніцтва службовай асобай гэтага хабару; невыкананне грамадзянінам дзеянняў, неабходных для перадачы хабару, па патрабаванні належнай асобы, магло прывесці да няшчасных наступстваў для грамадзяніна. Напрыклад, асоба, вінаватая ў вымагальніцтве, выкрывалася ў залежнасці ад абставінаў справы: высылка на пражыванне ў Сібір або накіраванне ў папраўчыя ўстановы; ці пазбаўленне ўсіх дзяржаўных правоў і высылка ў ізаляваныя месцы Сібіры; або, нарэшце, калі вымагальніцтва ажыццяўлялася шляхам катаванняў або іншага яўнага гвалту, пазбаўленнем усіх дзяржаўных правоў і высылкай на катаржныя работы на тэрмін ад шасці да васьмі гадоў (арт. 378). [20, с. 252–253].

Самае цяжкае пакаранне прадугледжвалася за непадпарадкаванне ўказам імператара. Санкцыя за невыкананне дыспазіцыі змяшчалася ў арт. 329 Улажэння 1885 г. і змяшчала ў сабе высылку на катаржныя работы служачага на тэрмін ад 10 да 12 гадоў у выпадку наўмыснага невыканання загаду. Але,

калі служачы дапусціў памылку па "легкомыслию или недостатку внимания к столь важной обязанности", то санкцыя была больш гуманнай: зняцце або звальненне са службы [20, с. 223].

Неабходна адзначыць, што многія дадзеныя аб злоўжыванні ўладай чыноўнікамі на тэрыторыі Беларусі ў час уваходжання яе ў склад Расійскай імперыі часам выдумляліся з мэтай дыскрэдытаваць служачых. Віленскі генерал-губернатар К. П. фон Каўфман (1865–1867) даў сваё заключэнне аб тым, што большая частка скаргаў пасля праверкі была несправядлівай: "Жалобы на администрацию возникают преимущественно от подстрекательства местного населения к подаче оных лицами, не сочувствующими распоряжениям правительства" [21, с. 248]. Прыкладам служыць сітуацыя, якая адбылася 14 студзеня 1899 г.: у Мінскае губернскае праўленне паступіла скарга аб хабарніцтве паліцэйскага ўрадніка чацвёртага табара Бабруйскага павета Ф. Бінкевіча. У тлумачальнай запісцы ад 27 студзеня 1899 г. ураднік указаў наступнае: "Я взяток ни в деньгах, ни в вещах от них никогда не брал и не требовал. Жалоба подана за то, что я сделал донесения на ряд лиц еврейского происхождения за различные виды нарушений, за что они были подвергнуты наказанию мирового судьи по моей вине. Евреи мне всегда говорили, что будут свидетельствовать в суде против меня, обвинять в получении взяток. Этим угрозам я никогда не придавал значения, так как взяток не брал" [22].

У якасці абагульнення адзначым, што ў першай чвэрці XIX ст. Аляксандрам I былі закладзены асноўныя кірункі антыкарупцыйнай палітыкі, якія ў наступным удасканальваліся. Акрамя выдання ўказаў і заканадаўчых актаў, уладай прымяняліся і іншыя антыкарупцыйныя механізмы, такія як: масавыя рэвізіі і рэзанансныя звальненні, барацьба з злоўжываннем патранажных сувязей у якасці сродку прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Але заканадаўчыя меры не ў поўным аб'ёме змяшчалі адказнасць за здзяйсненне супрацьпраўных дзеянняў: барацьба з хабарніцтвам магла быць больш паспяховай у тым выпадку, калі пакаранню падвяргаліся б і асобы, якія даюць служачаму хабар. Нягледзячы на тое, што дзяржава прымала ўсе неабходныя меры па барацьбе з карупцыяй, прычына карупцыйных дзеянняў зыходзіла у першую чаргу ад нізкага маральнага ўзроўню. Людзі не жадалі дабівацца поспехаў сваёй працай і сіламі, бо для гэтага неабходны час і цярпенне, таму звярталіся да паскораных варыянтаў дасягнення мэт, здзяйсняючы карупцыйныя дзеі. Людзі не надавалі значэнне ў поўнай меры той адказнасці, якую павінны былі несці ў сувязі з надыходам наступстваў. З улікам чалавечага фактару, уяўлялася неабходным правядзенне працы з правасвядомасцю людзей, гэта значыць, што барацьбы з карупцыяй на заканадаўчым узроўні ў Расійскай імперыі было недастаткова.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Гайдарева, И. Н. Актуальные проблемы противодействия коррупции в системе государственной службы / И. Н. Гайдарева // Вестник Адыгейского государственного университета. Серия 1: Регионоведение: философия, история, социология, юриспруденция, политология, культурология. – 2011. – № 3. – С. 301–307.

2. Воінава, А. Д. Процідзеянне карупцыйным дзеянням на беларускіх землях у XVIII–XIX стст. / А. Д. Воінава; навук. кір. В. М. Лянцэвіч // Сборник статей студентов факультета права Белорусского государственного экономического университета. Выпуск 3 / Министерство образования Республики Беларусь, Белорусский государственный экономический университет ; [редакционная коллегия: О. В. Бодакова, А. А. Малыщик, Е. М. Рацкевич]. – Минск : БГЭУ, 2023. – С. 48–53.

3. Вішнеўская, І. У. Заканадаўства XVIII-XIX стст. па супрацьдзеянні каррупцыі на тэрыторыі Беларусі / І. У. Вішнеўская // Проблемы управления. – 2021. – № 3(81). – С. 109–116.

4. Анішчанка, Я. Беларусь ў часы Кацярыны II (1772–1796) / Я. Анішчанка. – Мінск : Веды, 1998. – 211 с.

5. Полное собрание Законов Российской Империи, с. 1649 года. Первое собрание (1649-1825) : в 45 т. – Т. XXVII – СПб. : В тип. Второго отд. Собств. Его Император. Величества канц., 1802. – 1120 с.

6. Берлин, П. Из прошлого русской взятки / П. Берлин // Новая жизнь. – 1912. – № 10. – С. 156–186.

7. Полное собрание Законов Российской Империи, с. 1649 года. Второе Собрание (1825-1881) : в 55 т. – Т. 12 – СПб. : В тип. Второго отд. Собств. Его Император. Величества канц., 1837. – 822 с.

8 Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 1284. Оп. 91. Д. 24. Л. 9–12.

9 Лысенко, Л. М. Губернаторы и генерал-губернаторы Российской империи (XVIII – начало XX в.) / Л. М. Лысенко. – М. : Изд-во МПГУ, 2001. – 358 с.

10. Канцелярия Нижегородского губернатора (ЦАНО). – Ф. 2. Оп. 1. Ед. хр. 1169. Л. 11.

11. Пыркова, С. Б. Историческая роль губернаторов Российской Империи в противодействии взяточничеству и лихоимству в XVIII – начале XX вв. / С. Б. Пыркова // Ленинградский юридический журнал. – 2010. – № 2(20). – С. 175–185.

12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 299 Оп. 2. Д. 14778. Л. 15.

13. Захарьин, И. Н. Воспоминания о службе в Белоруссии 1864–1870 гг. (Из записок мирового посредника) / И. Н. Захарьин // Тени прошлого. Рассказы о былых делах. – СПб. : А. С. Суворин, 1885. – С. 164–324.

14. Кузьмин, А. Д. Социокультурный облик чиновничества белорусских губерний (1861–1914 гг.) / А. Д. Кузьмин. – Могилев : МГУП, 2017. – 187 с.

15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 299 Оп. 1. Д. 5441. Л. 7.

16. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 299 Оп. 2. Д. 9025. Л. 30.

17. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 299 Оп. 2. Д. 10995. Л. 9.

18. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 299 Оп. 2. Д. 10950. Л. 6-8.

19. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных. 1845 г. [Электронный ресурс]. – СПб. : Тип. Второго отд. Собств. Его Император. Величества канц. – Режим доступа : http://hdl.handle.net/11701/8933. – Дата доступа: 20.12.2023.

20. Таганцев, К. С. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных 1885 года / К. С. Таганцев. – 5-е изд., доп. – СПб. : Тип. М. Стасюлевича, 1886. – 714 с.

21. Комзолова, А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М. : Наука, 2005. – 383 с.

22. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 299 Оп. 2. Д. 10980. Л. 9.